Весткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

Viestki j Paviedamlenni

Сусьветнае сеціва: e-krama.com, pahonia.com
Электронны адрас: viestki@mail.com
P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735

№ 6 (592)
Чэрвень 2015 г.

Прыгоды саўка ў Амэрыцы

9-га траўня пуцінскія фашысты наладзілі ў Маскве масавы пэрформанс апантанасьці з нагоды 70-й гадавіны перамогі над гітлераўскай Нямеччынай ў 2-й Сусьветнай вайне. Рускае гёбельс-тэлебачаньне дастае ўсюды, і вар'ятаў яго рэтрансляцыі хапае па ўсім сьвеце. Але тут, у ЗША, гэтая зьява глыбока маргінальная. І толькі мы, беларусы і ўкраінцы, яе заўважаем, разумеючы сутнасьць.

Што зьдзіўляе ў Амэрыцы, гэта бесперашкоднае прыстанішча мноства расейска-камуністычных фунуцыянэраў Савецкай арміі і НКВД, спраўцаў СМЕРШу і карных атрадаў КГБ. Зьехаўшы ў сталым ўзросьце ў Амэрыку пад парасонам габрэйскай эміграцыі з СССР, яны жывуць тут доўга на поўным утрыманьні ("довольствии") амэрыканскай дзяржавы. Гэта значыць маюць дармовыя пэнсіі (не прапрацаваўшы і аднаго дня ў Амэрыцы). Ім выдзяляюць добрыя кватэры, за якія яны плоцяць адну дзясятую вартасьці кватэрнай платы (так званая 8-я праграма). Яны карыстаюцца тут прадуктовымі талонамі на яду (аплочанае дзяржавай харчаваньне), маюць бясплатна ўсе неабходныя мэдыцынскія страхоўкі, якімі пакрываецца ўсё лячэньне (вельмі дарагое ў Амэрыцы), маюць бясплатнае атрыманьне ўсіх неабходных лекаў і ўсяго мэдыцынскага рыштунку (сотні рэчаў ад калясак, ложка, бялізны, абутку, мэдыцынскіх прыладаў да драўлянай качарэжкі). Ім выдзяляецца (пры неабходнасьці) аплочаная дзяржавай сядзелка (home attendant), якая глядзіць за імі, варыць абеды, прыбірае, прысутнічае ў доме, суправаджае такога кліента на шпацыр альбо па крамах. Адзін-два разы ў месяц да іх наведваецца мэдсястра, якая пытае пра здароўе, і лекар па нагах, які абразае пазногці (апэрацыя абрэзкі пазногцяў – 150 даляраў для страхавой кампаніі). Пазногці на руках абразае іншы лекар. Пяць разоў на тыдзень падыходзіць аўтобус, і іх адвозяць у садок для пэнсіянэраў. Там іх забаўляюць "лекары-зацейнікі". Ім паказваюць канцэрты, яны слухаюць музыку, танцуюць, купаюцца ў басэйне і г. д. Потым іх адвозяць дадому.



Амэрыка ўнікальная краіна па сацыяльным забесьпячэньні бедных людзей. Паразытаў на ёй столькі, што не перастаеш зьдзіўляцца, як яна ўвогуле да гэтага часу існуе і ня валіцца.

Але зьдзіўленьне маё ня ў тым. Усе гэтыя камуністы-энкавэдысты-забойцы і "будаўнікі камунізму" атрымалі тут, у Амэрыцы, на халяву, нечакана для сябе той біялягічны рай, пра які ўвесь час гаварылі і абяцалі ў СССР, калі ўсе, маўляў, стануць жыць пры камунізме. Цяпер гэтыя ўтрыманцы Амэрыкі глядзяць тут расейскае тэлебачаньне і ... клянуць праклятую Амэрыку (кусаюць руку даючую). Праўда, ужо сілы ня тыя (скляроз, печань, дрыжэньне рук і т.п.). Ня чуваць, каб нехта зь іх казаў словы ўдзячнасьці гэтай краіне. Расейскі савок лічыць, што так і трэба – усе ўсюды ўсё павінны яму даваць. Пры гэтым некаторыя выхваляюцца: "Мы боролись с национализмом, ликвидировали бандэровские банды", "депортировали татар из Крыма – предателей народа", " иба Крым наш" і г.д. – увесь тэленабор.

Амэрыка жыве па законах, якія сама стварае. Калі б гэта былі не гэбоўскія вэтэраны генацыду і вайны, а нямецкія гестапаўцы і вэтэраны СС, то ім тут хуценька знайшлі б месца. Нават не дэпартавалі б (дарэчы, ніхто з злосных гэбоўскіх старцаў ня хоча вяртацца ў Расею), а сядзелі б яны ў турме пажыцьцёва, а некаторыя і ў электрычным крэсьле. Вэтэраны ж НКВД сядзяць на шыі "праклятых капіталістаў".

А ўсё таму, што не было міжнароднага трыбуналу і асуджэньня рускіх злачынстваў камунізму і вайны. Нюрнбэргскі працэс прызнаў вінаватым нямецкі фашызм за злачынствы супраць чалавецтва і няўхільнасьць пакараньня бяз тэрміну даўнасьці. Было створана міжнароднае заканадаўства, якое дапамагло вылавіць гітлерскіх спраўцаў па ўсім сьвеце. Расейскі камунізм і СССР, як ўдзельнік антыгітлераўскай кааліцыі, выступаў у якасьці пераможцы і абвінаваўцы. (Адзін бандыт абвінавачваў іншага бандыта за злачынствы і за вайну, якую яны падрыхтавалі і разьвязалі разам.)

У вайне паміж двума родамі фашызму цывілізаваны сьвет мусіў выбраць нейкі адзін бок, каб спыніць сусьветную вайну, якую разьвязалі нацызм з камунізмам, і ліквідаваць адно зло (адно з двух). Гэтак і атрымалася. Але расейскі камунізм апынуўся на баку пераможцаў. На гэтым савецкія камуністы пабудавалі ўсю сваю пасьляваенную палітычную ідэалогію па ўтрыманьні ўлады над народамі, прыватызаваўшы сабе перамогу над нямецкім фашызмам і ператварыўшы яе ў свайго роду палітычную рэлігію дзеля аббалваньваньня грамадзтва.

Нажаль такія ёсьць пэрэпэтыі злачыннай палітыкі, дзе пераможцаў ня судзяць і энкавэдысцкія савецкія доўгажыхары-вэтэраны, абвешаныя мэдалямі, яшчэ сноўдаюцца ў Нью-Ёрку, гатовыя (каб маглі) сесьці на галаву Амэрыцы. І нічога з гэтым нельга зрабіць. Няма міжнародных (і нават нацыянальных) законаў, каб зь імі разабрацца, судзіць, пакараць, дэпартаваць. Амэрыка пераварыць ўсё.

Зянон ПАЗЬНЯК

13 траўня 2015 г.

Травеньскі сход Згуртаваньня “Пагоня”

У суботу 9 траўня 2015 году ў Доме Маракоў на Мангэтане прайшоў чарговы, травеньскі сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”. Напачатку сходу старшыня “Пагоні” Віталь Зайка прывітаў прысутных і распавёў пра тое, што зроблена Згуртаваньнем, падзяліўся плянамі на будучыню. Ён зрабіў шэраг аб’яваў пра маючыя адбыцца імпрэзы – Купальле і Марш Паняволеных Народаў, у чэрвені й ліпені.

Затым са свам аналізам падзеяў у Беларусі і вакол яе, а таксама ва Украіне, выступіў старшыня Беларускага Народнага Фронту і Партыі КХП-БНФ Зянон Пазьняк. Ён пачаў сваю гутарку з заўвагаў адносна так званага Дня Перамогі, што шырака сьвяткуецца ў Расеі, і пераўтварыўся з сьвята памяці загінуўшых і здабыўшых перамогу над фашызмам у вакханалію сілаў, якія цяпер цяжка адрозьніць ад фашыстоўскіх. Прыкмкеты гэтай вакханаліі бачныя цяпер нават у Нью-Ёрку, за тысячы міляў ад Расеі. Людзі, якія бяруць у ёй удзел, чапляюць на сябе георгеўскія стужкі, часьцяком сіняй злобай ненавідзяць Амэрыку, не працаваўшы на яе ані дня, атрымаўшы ад яе ўсе мажлівыя і немажлівыя ільготы й выплаты.

Камуністычны генацыд і злачынствы супраць чалавецтва ніколі не былі афіцыйна і адкрыта асуджаныя. Не адбылося міжнароднага суду над камунізмам, які быў бы аналягам Нюрнбэргскага працэсу. Шмат дзе на ўсходзе, і асабліва ў Расеі, улада дасюль у руках былых камуністаў і прадстаўнікоў колішніх камуністычных спэцслужбаў. А на захадзе яшчэ шмат каму ачмурае мазгі прыгожая ідэя камуністыянай утопіі, крывавы рэальны досьвед якой так і застаўся па-за ўвагай левых лібэралаў. На нашых вачах адбываецца разбурэньне сьвету, збудаванага на пагадненьнях у Ялце 1945 году, якія забясьпечылі 70 год міру ў Эўропе.

Далей сп. З. Пазьняк нагадаў пра свой артыкул з 1994 году “Пра расейскі імпэрыялізм і ягоную небясьпеку”. У свой час вакол яго была ўсчатая кампанія цкаваньня аўтара, яго патрабавалі нават пазбавіць мандата дэпутата Вярхоўнага Савету Беларусі. Але цяпер відавочна, як да самых малых дэталяў спраўдзіліся засьцярогі, узгаданыя ў тым артыкуле. І цяпер відаць, што палітыка Расеі зрабіла вайну непазьбежнай, наблізіла новую сусьветную вайну. І гэта не звалілася з яснага неба – бо былі канфлікты ў Абхазіі й Прынястроўі, агрэсія ў Паўднёвай Асеціі і ўласна Грузіі, дэстабілізацыйная праца расейскай агентуры па ўсім сьвеце, пераўзбраеньне расейскага войска, нарошчваньне магутнасьці расейскай прапагандысцкай машыны. Усё амаль да апошніх дэталяў нагадвае шлях Нямеччыны ў часы нацыянал-сацыялізму, і гэта ярка выявілася для ўсяго сьвету ў аргэсіі супраць Украіны. Расея сёньня заяўляе нават пра мажлівасьць ужываньня тактычнай нуклеарнай зброі. Сёньня расейскі фашызм – гэта ідэалёгія “рускага сьвету”, што сьцьвярджае асобны “духовы код”, асобную, вышэйшую культуру і мову. На зьмену “сапсаванаму заходняй ідэалёгіяй” чалавецтву ідзе новы ідэальны чалавек – убэрмэнш расейскага разьліву. І менавіта ў гэтым полі, полі мовы й культуры, разгортваецца новы фронт змаганьня. Ачмурэньне ідзе і прыносіць вынікі – так і вялікая нямецкая нацыя пражыла ў ім ажно 12 гадоў, пакуль не настала трагічнае абуджэньне ад сну розуму. Нажаль, ідзе працэс ачмурэньня і ў Беларусі, дзе ўжо 20 год адбываецца ўнутраная акупацыя, краінай кіруе ўзурпатар, што быў пастаўлены маскоўскімі спэцслужбамі, а цяпер падпёрты расейскімі крэдытамі й экспартам энэрганосьбітаў.

Што ж неабходна рабіць у гэткай сытуацыі? Адказ: рыхтавацца. Рэальна ёсьць усё для супраціву і пераходу ў наступ – і людзі, і рэсурсы, і ідэі – менавіта ідэі, закладзеныя ў Акце 25 Сакавіка 1918 году. Трэба мацаваць дух праз умацоўваньне беларускай культуры. І гэта варта тлумачыць і распавядаць людзям. Простая лёгіка можа пераканаць нават самых ачмураных прапагандай. Скажам, апіраючыся на чыста эканамічны падыход, на карысьць – можна даказаць, якія шкодныя і самаразбуральныя ёсьць спадзевы на расейскія эканамічныя прывабы, на працу мігрантаў у Расеі й г.д. Дзе плоцяць падаткі тыя самыя мігранты, хто атрымлівае зь іх пэнсіі, карыстае на мэдабслугоўваньне? – Такія пытаньні здольныя працьвярэзіць самых зацятых расейскіх каханкаў у Беларусі. Поле працы – адукацыя, выхаваньне. Ёсьць людзі, якія прагнуць праўды, прагнуць сваёй сапраўднай тоеснасьці, сваёй мовы і культуры. Школа зьліквідаваная – але ёсьць сям’я, ёсьць досьвед папярэдніх пакаленьняў, ёсьць ідэя Сакавіка. Там, дзе гавораць, чытаюць, думаюць па-беларуску – “рускаму міру” рабіць няма чаго, там ён асуджаны на паразу і заняпад.



Наступным выступіў рэдактар бюлетэню “Весткі й Паведамленьні” Марат Клакоцкі з аповедам пра ўкраінцаў з Прагі, што ад імя сваёй суполкі даслалі Згуртаваньню “Пагоня” падзяку за збор сродкаў для ўкраінцаў, параненых у змаганьні супраць сэпаратыстаў, які прайшоў на дабрачынным канцэрце у лютым сёлета. Сп. Клакоцкі прачытаў тэкст падзякі і паказаў яе прысутным. Ён таксама паведаміў пра цікавага чалавека, украінца Алега Паўліва, які палюбіў беларускую мову, вывучыў яе і пачаў нават пісаць на ёй вершы.

Затым у разьдзеле “Рознае” адбыліся знаёмствы зь землякамі, якія першы раз прыйшлі на сход “Пагоні”. Прысутныя мелі мажлівасьць калегавацца пры сьціплых пачастунках, а таксама пазнаёміцца са сп. Зянонам Пазьняком, легендай Беларускага Адраджэньня, і сфатаграфавацца разам на памяць.

Віталь ЗАЙКА

Гісторыя жыцьцёвага падарожжа Сьвятаслава Шабовіча


Шабовіч, Сьвятаслаў. Ад фальварка Марцінова да Фармінгтонскіх узгоркаў: Гісторыя аднаго падарожжа. Мінск: Кнігазбор, 2015. — 260 с. — (Бібліятэка Бацькаўшчыны; кн. 24).

Новая кніга, выдадзеная ў сэрыі Згуртаваньня беларусаў сьвету “Бацькаўшчына”, уяўляе сабою ўспаміны беларускага эмігранта з так званага “пакаленьня Ды-Пі”. Маленства і юнацтва прадстаўнікоў гэтага пакаленьня прыпалі на вайну, бежанства 1944 году не было вынікам уласнага выбару, а на іх сьветапогляд і стаўленьне да Беларусі вызначальна паўплывалі гады, праведзеныя ў паваеннай Эўропе, найчасьцей у лягерох для перамешчаных асобаў.

Аўтар успамінаў “Ад фальварка Марцінова да Фармінгтонскіх ўзгоркаў” Сьвятаслаў Шабовіч нарадзіўся 17 лістапада 1932 г. у маёнтку, што знаходзіўся на тэрыторыі сёньняшняга Мядзельскага раёну Менскай вобласьці. Напярэдадні і ў часе Другой сусьветнай вайны ён страціў бацькоў і ў 12-гадовым узросьце назаўсёды пакінуў Беларусь, каб у выніку складанага падарожжа па ваеннай і паваеннай Эўропе асесьці на сталае жыцьцё ў ЗША.

Мэмуары Сьвятаслава Шабовіча – яскравае адлюстраваньне досьведу “дзяцей-эмігрантаў”, іх бачаньня падзеяў і сябе. У аповедзе шмат увагі аддаецца дзіцячым успамінам пра бацькоў, родныя мясьціны, падзеі вайны, у выніку якіх хлопец з трыма сёстрамі засталіся сіротамі. Далей ідзецца пра ўцёкі на Захад разам зь сям’ёю дзядзькі – праваслаўнага сьвятара Яна Жарскага, навучаньне ў Беларускай гімназіі імя Янкі Купалы. Уражлівая дзіцячая сьвядомасьць захавала побытавыя падрабязнасьці выезду зь Беларусі і бадзяньняў па паваеннай Эўропе. Аўтар памятае, як выглядалі будынкі, ваколіцы, людзі, якіх ён сустракаў у Польшчы, Чэхаславаччыне, Нямеччыне і пазьней у ЗША.

Выразнай адметнасьцю ўспамінаў Сьвятаслава Шабовіча ёсьць гранічная аўтарская шчырасьць і непасрэднасьць, на мяжы з аголенасьцю, што пераводзіць мэмуары ў іншы жанр – споведзь. Гэты тэкст, бадай першы ў эміграцыйнай (а мо ня толькі эміграцыйнай) мэмуарыстыцы, дзе аўтар расказвае пра ўласнае дзіцячае сутыкненьне з гвалтам у сям’і, з алькаголем, пра сэксуальныя назіраньні і перажываньні. Ва ўспамінах Сьвятаслава Шабовіча можна знайсьці рэфлексіі пра тое, што разьведзеная з бацькам маці мела натуральную патрэбу, каб побач быў мужчына. Таксама ў мэмуарах ёсьць згадкі, як, жывучы ў лягеры Ды-Пі



у Тырсгайме, архіяпіскап БАПЦ Філафей па начах сустракаўся з жанчынай, і ў вачах падлетка гэта выглядала зусім зразумелым. Усе гэткія, як і іншыя падобныя, моманты ў тэксьце, выглядаюць арганічна і суправаджаюцца шчырымі развагамі і назіраньнямі за чалавечай прыродай і сутнасьцю міжчалавечых дачыненьняў.

Яшчэ адна спэцыфічная рыса ўспамінаў Сьвятаслава Шабовіча – своеасаблівая цыклічнасьць аповеду. Кожны разьдзел пісаўся як адносна самастойны ўспамін з завершанай структурай, таму да найбольш важных падзеяў аўтар вяртаецца неаднойчы, згадваючы іх з рознымі падрабязнасьцямі. Да таго ж, відавочна, штуршком да пісаньня мэмуараў стала зьдзейсьненае на пачатку XXI ст. падарожжа па Эўропе і наведваньне Беларусі. Ад гэтых сваіх уражаньняў аўтар адштурхоўваецца ў аповедах.

“З фальварка Марцінова да Фармінгтонскіх узгоркаў” пісаліся першапачаткова як успаміны для сям’і – для дзяцей, унукаў, праўнукаў. І гэта адлюстравалася ня толькі ў ангельскай мове арыгіналу, удала перакладзенага для кніжнай публікацыі Віялетай Кавалёвай. Адбітак уяўленьня аўтара пра мэтавую аўдыторыю можна знайсьці ў тлумачэньнях некаторых рэчаў і зьяваў, людзям зь беларускім досьведам блізкіх і зразумелых. Так, народжаным у ЗША нашчадкам трэба было тлумачыць, як рабілі са збожжа муку, як без электрычнасьці ўзьбівалі масла, як выглядала лазьня і г. д. З пазыцыі ўжо амэрыканца Сьвятаслаў Шабовіч тлумачыць, чаму вясковы сабака мусіў жыць у будцы, і што гэта не ўспрымалася як зьдзек з жывёлы. Гэткія ж рэфлексіі з пазыцыі гадоў, пражытых у ЗША, над рэпрэсіямі, пад якія патрапіў бацька, над дзейнасьцю партызанаў, што забілі маці і бабулю, над бамбардаваньнямі нямецкіх гарадоў і іншым – таксама неад’емная частка ўспамінаў.

Сытуацыя Сьвятаслава Шабовіча адметная яшчэ і тым, што на эміграцыі ён быў мала заангажаваны ў беларускую дзейнасьць. Усьведамляючы сябе беларусам, ён пераважна трапляў у асяродкі, далёкія ад сталай нацыянальнай актыўнасьці суродзічаў. І значная частка ягоных і “нямецкіх” успамінаў, і “амэрыканскіх” – гэта аповед пра падзеі ўласнага сталеньня, пошуку месца ў жыцьці.

Аўтар успамінаў зь дзяцінства марыў пра Амэрыку, куды езьдзіў калісьці на заробкі ягоны бацька, і дзе застаўся бацькавы брат. І цалкам заканамерна, што жыцьцёвае падарожжа прывяло Сьвятаслава Шабовіча ў 1949 г. менавіта ў ЗША. “Амэрыканская” частка ўспамінаў, што ўвайшлі ў гэтую кнігу, закранае толькі прыезд, спатканьне зь дзядзькам Пятром і пераезд да яго ды службу ў амэрыканскай арміі. Па-за гэтым тэкстам засталося жыцьцё ў Дэтройце ў сям’і аднаго з найбольш дзейных мясцовых беларусаў Міколы Прускага, навучаньне ва ўнівэрсытэце, уладкаваньне на працу (Сьвятаслаў Шабовіч амаль усё жыцьцё працаваў унівэрсытэцкім бібліятэкарам), стварэньне сям’і зь Люсіль Бат... Аднак, нягледзячы на пэўную незавершанасьць аповеду, гісторыя жыцьцёвага падарожжа прадстаўніка “пакаленьня Ды-Пі” мае каштоўнасьць і з гістарычнага, і зь літаратурнага гледзішча.

Сёньня спадарства Шабовічаў жыве ў Фармінгтан-Гілз (штат Мічыган). Нягледзячы на абставіны жыцьця ў розных аддаленых штатах, Сьвятаслаў Шабовіч падтрымоўваў сувязі зь беларускімі суродзічамі. Дзякуючы гэтаму ягоныя мэмуары і ня зьніклі ў моры сямейных амэрыканскіх успамінаў. Заўважаныя Вітаўтам Кіпелем, яны урэшце знайшлі свой шлях да чытача і, з камэнтарамі і ілюстрацыямі зь сямейнага архіву, сталі яшчэ адным яскравым голасам таго самага “пакаленьня Ды-Пі”.

Натальля ГАРДЗІЕНКА

У Менску парад прымаў НКВД

Эўропа такога ня бачыла даўно. А можа й ніколі ня бачыла. Такое прынята ў асноўным у Афрыцы і ў Лацінскай Амэрыцы. Спрацоўвае посткаляніяльны сындром. Напяльваючы на сябе ўніформы і знакі ўзору былых гаспадароў-калянізатараў, посткаляніяльныя нуворышы імкнуцца насьледваць іх і дэманструюць, што яны цяпер роўныя былым калянізатарам.

У афрыканскіх краінах усе спрэс ва ўніформах брытанскага і францускага вайсковага пакрою (паводле былой прыналежнасьці да адпаведнай імпэрыі). Чылійскі дыктатар генэрал Піначэт скапіраваў уніформы для арміі з гітлерскага вэрмахту, а маршыравала чылійская армія прускім крокам пад гістарычныя прускія маршы. Што праўда, ніхто з гэтых "касьцюмераў" аніразу не дадумаўся дэфіляваць у чорных муньдзірах гестапа з адным пагонам альбо ва ўніформах імпэрскіх спэцслужбаў, якія катавалі і забівалі афрыканскіх змагароў за незалежнасьць і проста мірных жыхароў.



На афіцыёзным парадзе ў Менску 9 траўня начальства (у тым ліку і галоўны начальнік) стаяла на трыбуне ў савецкіх муньдзірах зь невялічкімі дадаткамі прыналежнасьці да "РБ". А вось адзін стаяў сярод іх ва ўніформе НКВД ўзору 1943 году. І гэта быў ня проста акцёр арыгінальнага жанру, а (як аказалася) майстра пераўвасабленьня міністар унутраных справаў "РБ" тав. Шуневіч. Ніхто ня чуў пакуль, што кадры МУС Беларусі пераведзеныя на ўніформу НКВД СССР, таму людзі зьдзівіліся і пачалі задаваць пытаньні.

"Белрэдакцыя" Радыё Свабода запрасіла ў студыю двух экспэртаў, якія патлумачылі нам, у чым справа. Цытуем экспэрта адстаўнога генэрала міліцыі М. Грыба: "Гэтая форма была ўведзеная ў 1943 годзе, падчас вайны. І таму міністар, мабыць, хацеў падкрэсьліць вялікую значнасьць для сябе гэтай перамогі".

Другім экспэртам выступіў культуроляг С. Харэўскі: "Вядома, незвычайную форму міністра Шуневіча можна сьпісаць на карнавал і пасьмяяцца. Але звычайна такія „карнавалы" адбываюцца падчас грамадзянскіх войнаў. І ад гэтага мне робіцца трывожна".

Гэта прагучала больш уцямна, чым генэральскі камэнтар. Але потым культуроляг напалохаўся і пачаў спасылацца на "аўтарытэты": "Ацэнку тут павінен даць галоўнакамандуючы". Крыніца: *http://www.svaboda.org/content/navosta-ministar-sunievic-nadzieu-formu-kamisara-nkvd/27011875.html*

Нагадаем, што "галоўнакамандуючым" ёсьць начальнік антыбеларускага рэжыму. І адбываўся не карнавал з фанэрнымі танкамі, а ўсё было на поўным сур'ёзе, з сапраўднай баявой тэхнікай, расейскімі войскамі, гуканьнямі ў стылі "мы ім пакажам!" і г.д. Ды й міністры ня могуць мяняць па сваёй прыхамаці ўніформы і шэўроны. Мы робім выснову, што так яно й было задумана, разам з "галоўнакамандуючым". Прычым загад на "міністэрскі касьцюм" прышоў з Масквы. Крэмль у чарговы раз выкарыстоўвае нашу Беларусь як лябараторыю для сваіх экспэрымэнтаў. Вынікі экспэрымэнту аналізуюцца, а потым адпрацаванае рэалізуецца на прасторах Расеі. Што ж хацела апрабаваць Масква на міністры Рэспублікі Беларусь?

Апрабоўваўся "мэсыдж нашага часу" – а менавіта курс на палітыку КПСС-НКВД з усімі "асаблівасьцямі" такога курсу: масавымі рэпрэсіямі, ізаляцыяй ад цывілізаванага сьвету, таталітарызмам і г.д. Цяпер трэба чакаць, што ў Маскве і па ўсёй РФ начальства будзе фарсіць у муньдзірах НКВД ды й рабіць тую ж справу.

Вось да чаго прыводзіць захаваньне у сучасным жыцьці савецкай сымболікі, чырвоных сьцягоў, помнікаў Леніну і бальшавікам, трызьненьне пра "это же наша історія!" Гэта заканчваецца рэанімацыяй чэкісцкіх трупаў і вяртаньнем у жудасную мінуўшчыну, зь якой камусьці не хацелася разьвітацца.

Сымон РУДЗІК

http://www.narodnaja-partyja.org

Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàííí³:

А. Буракоў 60
В. Красьнік 60
Усім шчыры дзякуй!

Паважаныя ***І. Кумец, Н. Лазоўская, А. Петрусевіч і А. Цяценькін,*** *калі ласка, паведаміце рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:
P. O. Box 572
New York, NY 10113
Чэкі выпісвайце на імя
Viktar Yedzinovich.

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

адбудзецца ў суботу **13-га чэрвеня 2015 г.** у Доме Маракоў па адрасу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

Даезд цягнікамі падземкі ***L, N, Q, R, W, 4, 5, 6*** *да прыпынка* ***Union Square****. Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад* ***Union Square*** *па* ***15-й вуліцы*** *на скрыжаваньні з* ***Irving Place. Заля на 2-м паверсе.***

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

А. Буракоў 30
В. Красьнік 30
Шчыры дзякуй!

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (****$30****) на адрас:*

Marat Klakotski
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

Чэкі з адзнакаю ***"Весткі"*** *выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня "Пагоня"* ***Viktar Yedzinovich.***

Электронны варыянт бюлетэня можна знайсьці ў інтэрнэце на сайце ***e-krama.com***